УДК 94:327.56(470+438)"1922"

М. М. Мязга

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ГЕНУЭЗСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ І ПЫТАННЕ ЎСХОДНЯЙ ГРАНІЦЫ ПОЛЬШЧЫ

У артыкуле разгледжана праблема прызнання польскай усходняй граніцы ў сувязі з Генуэзскай канферэнцыяй. Высветлена, што напярэдадні канферэнцыі польскія правячыя колы былі ўстрывожаны магчымасцю пастаноўкі на ёй пытання аб перагледзе ўсходняй граніцы краіны. У ходзе канферэнцыі польская дыпламатыя не дабілася міжнароднага прызнання граніц сваёй дзяржавы на ўсходзе, але ўдалося пазбегнуць і дыскусіі аб іх пераглядзе. З канца студзеня 1922 г. міжнародная сітуацыя ў Еўропе вызначалася ў многім падрыхтоўкай да набліжаючайся Генуэзскай канферэнцыі. Польскі ўрад быў занепакоены магчымасцю пастаноўкі ў Генуе пытання аб усходняй граніцы краіны. 10 студзеня праблемы, звязаныя з падрыхтоўкай да будучай канферэнцыі, абмяркоўваліся на пасяджэнні польскага ўрада. Пасол у Францыі М. Замойскі пад час дыскусіі заявіў, што ў выбарах ў Віленскі сейм Францыя хацела б бачыць крок, які вядзе да федэрацыі паміж Літвой і Польшчай. У выпадку прыняцця рашэння аб інкарпарацыі Віленшчыны ў склад Польшчы, Францыя не змагла б адстойваць правы Польшчы на гэтую тэрыторыю на міжнароднай арэне. Міністр замежных спраў К. Скірмунт на гэтым жа пасяджэнні адзначыў, что рашэнне віленскага пытання ў адпаведнасці з інтарэсамі заходніх дзяржаў дапаможа Польшчы без праблем атрымаць іх згоду на заходнюю граніцу [1, с. 89]. Аднак віленскае пытанне было вырашана шляхам інкарпарацыі гэтай тэрыторыі ў склад Польшчы, што не адпавядала пазіцыі заходніх дзяржаў і магло стварыць для Польшчы пэўныя праблемы на набліжаўшайся канферэнцыі. На думку польскай дыпламатыі, пагроза ўзняцця віленскага пытання зыходзіла таксама з боку Масквы і Берліна. 13 сакавіка польскі паверaны ў справах у Маскве ўручыў ноту савецкаму ўраду, якая была прысвечана пазіцыі РСФСР у польска-літоўскай спрэчцы з-за Вільні. У ёй выказваўся пратэст у сувязі з передачай савецкім урадам Літве маёмасці, якая была вывезена ў свой час на тэрыторыю Расіі з тэрыторыі Віленшчыны. Гэта трактавалася як парушэнне савецкім бокам Рыжскага дагавора, які, як лічылі палякі, абавязваў Савецкую Расію заставацца нейтральнай ў польска-літоўскай спрэчцы [2, с. 222]. Савецкі адказ быў атрыманы толькі 15 красавіка. У ім заяўлялася, што Рыжскі дагавор не адмяніў савецкалітоўскі дагавор ад 12 ліпеня 1920 г., згодна якому Вільня прызнана часткаю Літвы. Адпаведна, дзеянні літоўска-расійскай камісіі па перадачы Літве маёмасці, якая была вывезена з тэрыторыі Віленшчыны, абвяшчалася цалкам абгрунтаванай [2, с. 221]. У данясенні польскага пасольства ў Германіі ад 10 красавіка паведамлялася аб намеры савецкай дэлегацыі ў Генуі выступіць, прычым сумесна з Германіяй, за прыналежнасць Вільні Літве. Узгодненая пазіцыя Расіі і Германіі па гэтаму пытанню звязвалася з іх агульнай зацікаўленасцю ў транзіце праз тэрыторыю Літвы [3, ł. 13]. Польскі ўрад напярэдадні Генуэзскай канферэнцыі сігналізаваў Маскве аб жаданні паляпшэння адносін пры ўмове, што Савецкая Расія не будзе падтрымліваць Літву ў тэрытарыяльнай спрэчцы з Польшчай і не ўздыме пытанне аб Рыжскім дагаворы, усталяванай ім граніцы [4, с. 201]. На пасяджэнні палітычнага камітэта польскага ўрада 24 студзеня было адзначана, што Польшча не можа пайсці на ўдзел у Генуэзскай канферэнцыі без папярэдніх умоў. Галоўнае, аб чым імкнулася дамовіцца Польшча з іншымі краінамі напярэдадні канферэнцыі, – абарона заключаных дагавароў і недапушчэнне дыскусіі па іх [4, с. 193–194]. К. Світальскі ў сваім дзённіку адзначаў заклапочанасць Ю. Пілсудскага, які лічыў, што для Польшчы існуе небяспека пастаноўкі ў Генуі пытання аб прызнанні Рыжскага дагавора [5, s. 135]. 68 Пры гэтым польскі ўрад адчуваў сур’ёзныя сумненні адносна падтрымкі ў пытанні аб граніцы з боку краін Антанты. У прыватнасці, гэта датычылася праблемы Усходняй Галіцыі. Польскае міністэрства замежных спраў валодала інфармацыяй, згодна якой у правячых колах Вялікабрытаніі не існавала адзінага пункту гледжання адносна будучага названага рэгіёна. Хоць Д. Ллойд Джордж у гутарцы з румынскім прэм’ер-міністрам Таке Іанеску заявіў аб гатоўнасці перадаць Усходнюю Галіцыю

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Польшчы «на пэўных умовах». Тым не менш, у Польшчы засталася занепакоенасць, што пытанне аб Усходняй Галіцыі мажа стаць у ходзе перамоў з РСФСР разменнай манетай у руках англійскай дэлегацыі [6, с. 33]. Кракаўская кансерватыўная газета «Час» у лютым 1922 г. адзначала, што, зыходзячы з матэрыялаў англійскага друку, Англія па-ранейшаму разглядае як польскую тэрыторыю толькі да Буга і Сана [7, арк. 26]. Вясной 1922 г. пытанне Усходняй Галіцыі абмяркоўвалася спецыяльным камітэтам Лігі Нацый. Было прянята рашэнне лічыць Усходнюю Галіцыю незалежнай рэспублікай [8, арк. 34], што не адпавядала польскім інтарэсам. Літаральна напярэдадні канферэнцыі 22 сакавіка 1922 г. бюлетэнь беларускага прэс-бюро ў Коўна паведаміў, што ўрад Галіцыйскай Рэспублікі атрымаў паведамленне Сакратарыяту Лігі Нацый. У ім гаварылася, што спецыяльны камітэт Лігі Нацый разглядаў усходне-галіцыйскае пытанне і прыняў рашэнне адстойваць незалежнасць Галіцыйскай рэспублікі. Таксама паведамлялася аб публікацыях у англійскім друку, у якіх падвяргалася крытыцы імперыялістычная палітыка Польшчы, якая ўвасаблялася ў захопе велізарнай прасторы на ўсходзе Еўропы [7, арк. 34]. Французскую падтрымку ў справе прызнання польскай граніцы на ўсходзе ўрад Польшчы спрабаваў атрымаць праз наданне юрыдычнай сілы польска-французскаму саюзу ад 19 лютага 1921 г. 5 лютага 1922 г. у Парыжы былі падпісаны эканамічныя пагадненні паміж дзвюма краінамі. 12 мая сейм ратыфікаваў пагадненні з Францыяй, пасля чаго і саюзны дагавор уступіў у сілу [9, s. 617–618]. Польская дыпламатыя здзейсніла першы крок да прызнання сваіх усходніх граніц на міжнародным ўзроўні праз падпісанне Варшаўскага пагаднення ад 17 сакавіка 1922 г. Згодна з ім Польшча, Фінляндыя, Эстонія і Латвія ўзаемна прызналі мірныя дагаворы, якія яны заключылі з Савецкай Расіяй, у тым ліку і Рыжскі дагавор [10, с. 48]. Напярэдадні Генуэзскай канферэнцыі К. Скірмунт наведаў Парыж і Лондан. Галоўная мэта візітаў заключалася ў тым, каб схіліць вядучыя дзяржавы Захаду да прымальнага для Польшчы вырашэння пытання аб яе ўсходняй граніцы. У Лондане польскі міністр заявіў, што Польшча не мае намеру ўдзельнічаць у якім-небудзь новым нападзенні на Савецкую Расію і не будзе ставіць перашкод агульнаму прызнанню Савецкай Расіі, бо «такім чынам будзе аўтаматычна пацверджаны Рыжскі дагавор». Тым не менш, у ходзе сустрэчы з польскім міністрам англійскі прэм’ер-міністр не адмаўляў магчымасці дэбатаў па пытанню граніц Польшчы ў ходзе канферэнцыі. Візіт К. Скірмунта ў Лондан меў пэўны станоўчы эфект для вырашэння важнага для Польшчы пытання аб граніцы. У падрыхтаваным Форын офіс мемарандуме па праблеме дагавораў з Расіяй указвалася, што ў знешнепалітычныя інтарэсы Вялікабрытаніі цалкам упісваецца прызнанне Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. [6, с. 33–34]. Польскія кіруючыя колы былі ўстрывожаны тым, што прадстаўнікі нацыянальных рухаў перыядычна ўздымалі пытанне аб усходніх ускраінах Польскай дзяржавы. У лютым 1922 г. урад БНР звярнуўся з мемарандумам да Генуэзскай канферэнцыі. У ім адзначаўся падзел Беларусі на тры часткі: цэнтральная ў выглядзе БССР, усходняя, былыя Магілёўская і Віцебская губерні, уключаная ў склад Савецкай Расіі, заходняя – акупавана Польшчай. Утрымліваўся заклік не прызнаваць рыжскую граніцу, бо гэта было б гвалтам над Беларуссю. Мемарандум утрымліваў просьбу прызнаць, што «прытэнзіі Савецкай Расіі і Польшчы на тэрыторыю суверэннага Беларускага Народа не маюць пад сабой ніякіх асноў». Адмова іх ад такіх прэтэнзій павінна стаць асновай міра паміж Расіяй і Польшчай у будучым. Урад БНР прасіў уключыць у парадак дня канферэнцыі пытанне аб пераглядзе Рыжскага дагавора і, як вынік, яго адмену [1, с. 68–71, с. 99–103]. 27 красавіка ў Геную прыбыла дэлегацыя БНР на чале з В. Ластоўскім. У мемарандуме, які дэлегацыя ўручыла старшыні канферэнцыі, утрымліваўся пратэст супраць далучэння Віленскага краю да Польшчы, і 69 прапаноўвалася яго далучэнне да Літвы. БНР выступала за стварэнне на тэрыторыі Заходняй Беларусі «нейтральнага пояса» пад пратэктаратам вялікіх дзяржаў. Але канферэнцыя не прыняла беларускіх прапаноў [11, с.80]. Прадстаўнікі Усходняй Галіцыі таксама ўручылі ўдзельнікам Генуэзскай канферэнцыі мемарандум з пратэстам супраць уключэння гэтай тэрыторыі ў склад Польшчы [12, с. 35]. 14 красавіка К. Скірмунт звярнуўся да ўдзельнікаў канферэнцыі з нотай. У ёй адзначалася неабходнасць прызнання польскай усходняй граніцы для ўсталявання трывалага міру і эканамічнага аднаўлення Еўропы [13, s. 29]. Але гэтая спроба

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Польшчы дамагчыся ў Генуі прызнання сваіх граніц не дала станоўчага выніку, галоўным чынам з-за адмоўнай пазіцыі Вялікабрытаніі. Звароты нацыянальных рухаў далі падставы Д. Ллойд Джорджу заявіць аб неабходнасці разгледзець на канферэнцыі тэрытарыяльныя пытанні ва Усходняй Еўропе. Толькі пагроза польскай дэлегацыі пакінуць Геную, і заява часткі дэлегацый, што канферэнцыя прысвечана эканамічным, а не тэрытарыяльнам праблемам, прымусілі англійскага прэм’ер-міністра зняць тэрытарыяльнае пытанне. Яго выступленне спрабавала выкарыстаць савецкая дыпламатыя. Дэлегацыя РСФСР у ходзе працы Генуэзскай канферэнцыі была не супраць, каб адбылося абмеркаванне пытання аб польскай усходняй граніцы. У адказе расійскай дэлегацыі 11 мая на мемарандум заходніх краін ад 2 мая адвяргалася патрабаванне «ўстрымлівацца ад усялякага выступлення, якое можа парушаць палітычны ці тэрытарыяльны статус-кво іншых дзяржаў». Савецкая дэлегацыя трактавала гэта як спробу прымусіць яе прызнаць дагаворы, якія былі заключаны іншымі дзяржавамі [10, с. 235]. Гэта магло датычыцца міжнародных пагадненняў, якія рэгулявалі статус Віленшчыны, Усходняй Галіцыі. Савецкая пазіцыя была дваістай. З аднаго боку, РСФСР публічна выказвалася за прызнанне дагавораў, якія іншыя дзяржавы заключылі з Савецкай Расіяй, у тым ліку і Рыжскага. 18 мая на пасяджэнні канферэнцыі Г. Чычэрын заявіў, што згодна яго пункту гледжання арт. 6 праектуемага ўдзельнікамі канферэнцыі дагавора аб ненападзенні мае на ўвазе захаванне тэрытарыяльнага статус-кво усіх дзяржаў, якія заключылі дагаворы з Расіяй і падтрымаў такі падыход [10, с. 300]. З другога боку, не выключалася магчымасць паставіць пад сумненне лігітымнасць рыжскай граніцы. У. Ленін у тэлеграме Г. Чычэрыну ў Геную адзначаў, што неабходна выкарыстаць пастаноўку Ллойд Джорджам пытання аб усходніх граніцах Польшчы і Румыніі, падкрэсліваючы, «што гэтыя граніцы перашкода да ўсталявання міру» [1, с. 111]. 17 мая на пасяджэнні Генуэзскай канферэнцыі абмяркоўвалася пытанне аб заключэнні калектыўнага дагавора аб ненападзенні. К. Скірмунт заявіў аб гатоўнасці Польшчы ўдзельнічаць у названым дагаворы, але пры ўмове, што гэта не пацягне за сабою ніякіх змен у «абавязацельствах, прынятых на сябе бакамі ў названым Рыжскім дагаворы». Польскі міністр настойваў, каб гэтая агаворка была далучана да праектуемага дагавора [10, с. 263]. Вынікі Генуэзскай канферэнцыі для Польшчы ў плане прызнання яе ўсходніх граніц не былі адназначнымі. З аднаго боку, яна не змагла вырашыць пытанне іх міжнароднага прызнання. Але, з другога боку, польская дыпламатыя змагла пазбегнуць рэальнага абмеркавання на канфенрэнцыі пытання аб статусе ўсходніх граніц Польшчы.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. – Мінск : «Юніпак», 2012. – Т. 2 – 480 с. 2. Документы внешней политики СССР : в 22 т. – М. : Госполитиздат, 1961. – Т. 5. – 806 с. 3. Archiw Aktow Nowych. – MSZ. Sygn. 6629. 4. Mikulicz, S. Polityczne manewry polskiey dyplomacji przed konferencja w Genui. 1922 / S. Mikulicz \\ Studia z najnowszych dziejow powczesnych. – 1963. – T. 3. – S. 191–208. 70 5. Switalski, K. Diariusz. 1919–1935 / K. Switalski. – Warszawa : Wyd. “Czytalnik”, 1992. – 224 s. 6. Дубровко, Е. Н. Вопрос о признании польско-советской границы и позиция Великобритании в период подготовки Генуэзской конференции 1922 г. / Е. Н. Дубровко // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2013. – № 4 (79). – С. 28–36. 7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 325. Воп. 1. Спр.212. 8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 325. Воп. 1. Спр.178. 9. Kumaniecki, W. Odbudowa panstwowosci Polskiej / W. Kumaniecki. – Warszawa – Kraków : Gebethner i Wolff, 1924. – 784 s. 10. Генуэзская конференция. 1922. Материалы Генуэзской конференции : (Подготовка, отчеты заседаний, работы комиссии, дипломатическая переписка и пр.) / [ред. Г. Б. Сандомирский]. – М., 1922. – 459 с. 11. Лазько, Р. Р. Беларусь ў еўрапейскай палітыцы. 1918–1925 гг. Нарысы / Р. Р. Лазько, А. М. Кротаў, М. М. Мязга. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2003. – 126 с. 12. Зубачевский, В. А. Политика России в отношении восточной части Центральной Европы. (1917–1923 гг.) автореф. дис. ... докт. ист. наук / В. А. Зубачевский. – М. : МГУ, 2006. – 40 с. 13. Lassowski, P. Z dziejow polityki zagranicznej – ministrowie Skirmunt, Narutowicz, Skrzynski / P. Lassowski // Kwartalnik historyczny – Rocznik XCV. – Nr. 3. – 1989. – S. 17–45.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ